ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова прэзідыума Рэспубліканскага камітэта Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі
09.01.2024 № 1/1

ПАЛАЖЭННЕ
аб Ганаровай грамаце Рэспубліканскага камітэта Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзенае Палажэнне рэгулюе пытанні дзейнасці Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі (далей – Прафсаюз) па ўзнагароджанні Ганаровай граматай Рэспубліканскага камітэта Прафсаюза (далей – Ганаровая грамата).

2. Ганаровая грамата з’яўляецца формай узнагароджання:

2.1. работнікаў, навучэнцаў арганізацый адукацыі, ветэранаў працы галіны – членаў Прафсаюза;

2.2. арганізацыйных структур Прафсаюза;

2.3. іншых асоб і арганізацый.

3. Ганаровай граматай узнагароджваюцца за важкі ўклад у рэалізацыю статутных задач Прафсаюза, удасканаленне форм і метадаў прафсаюзнай работы, іміджу Прафсаюза і прафсаюзнага руху, сацыяльна-эканамічнае развіццё галіны праз:

3.1. дасягненні ў рабоце па абароне працоўных, сацыяльна-эканамічных правоў і законных інтарэсаў членаў Прафсаюза;

3.2. высокія паказчыкі развіцця сацыяльнага партнёрства ў галіне, садзеянне Прафсаюзу ў рэалізацыі праграм яго дзейнасці;

3.3. паспяховае ажыццяўленне сацыяльна-эканамічных праграм, стварэнне спрыяльных умоў працы для працоўных галіны;

3.4. плённую работу па арганізацыі быту і вольнага часу членаў Прафсаюза, развіццё культурна-выхаваўчай і спартыўна-аздараўленчай работы;

3.5. сістэматычнае інфармаванне аб дзейнасці Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, Прафсаюза і прафсаюзнай арганізацыі ў сродках масавай інфармацыі, на сайтах і тэлеграм-каналах арганізацыйных структур Прафсаюза, папулярызацыю ідэй прафсаюзнага руху сярод

працоўных і навучэнцаў галіны.

4. Да асоб, кандыдатуры якіх прадстаўляюцца да ўзнагароджання Ганаровай граматай, прад'яўляюцца наступныя патрабаванні:

4.1. стаж актыўнай дзейнасці ў Прафсаюзе не менш пяці гадоў;

4.2. наяўнасць Падзякі, Граматы Рэспубліканскага камітэта Прафсаюза;

4.3. значныя дасягненні ў актывізацыі і пашырэнні прафсаюзнага руху, удасканаленні форм і метадаў прафсаюзнай работы.

5. Да арганізацыйных структур Прафсаюза, якія прадстаўляюцца да ўзнагароджання Ганаровай граматай, прад'яўляюцца наступныя патрабаванні:

5.1. высокі узровень ахопу прафсаюзным членствам і (ці) колькасны рост прафсаюзнай арганізацыі, іншыя паказчыкі дынамікі яе развіцця;

5.2. высокі ўзровень пастаноўкі арганізацыйнай работы, узаемадзеянне са сродкамі масавай інфармацыі, грамадскага кантролю за выкананнем заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб працы і ахове працы, іншых кірункаў прафсаюзнай работы, арганізацыі выканання рашэнняў з'ездаў Прафсаюза, Рэспубліканскага камітэта Прафсаюза і яго прэзідыума;

5.3. наяўнасць прызоў за ўдзел прадстаўнікоў пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі ў рэспубліканскіх аглядах, конкурсах, фестывалях, спартакіядах, іншых мерапрыемствах, якія праводзіліся пад эгідай Прафсаюза.

6. Форму бланка Ганаровай граматы зацвярджае прэзідыум Рэспубліканскага камітэта Прафсаюза.

## ГЛАВА 2
## ПАРАДАК ПРАДСТАЎЛЕННЯ ДА ЎЗНАГАРОДЖАННЯ

7. Прадстаўленне кандыдатур і арганізацыйных структур Прафсаюза да ўзнагароджання Ганаровай граматай могуць ажыццяўляць:

7.1. старшыня Прафсаюза, яго намеснікі, члены прэзідыума Рэспубліканскага камітэта, аддзелы Прафсаюза шляхам накіравання прэзідыуму Рэспубліканскага камітэта Прафсаюза прадстаўлення кандыдатуры (кандыдатур), арганізацыйных структур Прафсаюза да ўзнагароджання або службовай запіскі;

7.2. абласныя (Мінскі гарадскі) камітэты Прафсаюза, аб'яднаны прафсаюзны камітэт работнікаў НАН Беларусі, прафсаюзныя камітэты пярвічных прафсаюзных арганізацый, якія знаходзяцца на прафсаюзным абслугоўванні ў Прафсаюзе, шляхам накіравання прэзідыуму Рэспубліканскага камітэта Прафсаюза:

7.2.1. суправаджальнага пісьма;

7.2.2. пастановы адпаведнага прафсаюзнага органа;

7.2.3. узнагароднага ліста ўстаноўленай прэзідыумам Рэспубліканскага камітэта Прафсаюза формы, на арганізацыйныя структуры Прафсаюза – кароткія даведкі аб іх працы, падрыхтаваныя адпаведнымі арганізацыйнымі структурамі Прафсаюза.

8. Паўторнае ўзнагароджанне Ганаровай граматай у тэрмін не менш, чым за 2 гады з даты папярэдняга ўзнагароджання дапускаецца пры наяўнасці выключных заслуг прадстаўленай кандыдатуры, арганізацыйнай структуры Прафсаюза у гэты перыяд.

9. Дакументы да ўзнагароджання Ганаровай граматай накіроўваюцца ў Прафсаюз ў тэрмін не пазней за месяц да правядзення чарговага пасяджэння прэзідыума Рэспубліканскага камітэта Прафсаюза.

10. Узнагародныя лісты афармляюцца на беларускай мове.

11. Падрыхтаваныя з парушэннямі ўстаноўленага парадку дакументы вяртаюцца адпаведным арганізацыйным структурам Прафсаюза для дапрацоўкі.

## ГЛАВА 3
## ПАРАДАК УЗНАГАРОДЖАННЯ

12. Рашэнне аб узнагароджанні Ганаровай граматай прымаецца прэзідыумам Рэспубліканскага камітэта Прафсаюза шляхам выдання адпаведнай пастановы.

13. Падрыхтоўку праекту пастановы аб узнагароджанні Ганаровай граматай, афармленне яе бланкаў, занясенне дадзеных узнагароджаных Ганаровай граматай асоб, арганізацыйных структур Прафсаюза ў банк адпаведных дадзеных ажыццяўляе галоўны спецыяліст Прафсаюза.

14. Уручэнне Ганаровай граматы ва ўрачыстай абстаноўцы, як правіла, на пленумах Рэспубліканскага камітэта Прафсаюза, пасяджэннях яго прэзідыума, іншых статутных мерапрыемствах забяспечвае Прафсаюз, арганізацыйныя структуры Прафсаюза, якія хадайнічалі аб узнагароджанні Ганаровай граматай.

15. Запіс аб узнагароджанні Ганаровай граматай заносіцца ў працоўную кніжку, асабістую справу. Пры ўзнагароджанні Ганаровай граматай арганізацыйнай структуры Прафсаюза такі запіс не ажыццяўляецца.

16. Узнагароджаным Ганаровай граматай асобам і арганізацыйным структурам Прафсаюза выдаецца аднаразовае грашовае ўзнагароджанне ў памеры пяці і шасці базавых велічынь адпаведна за кошт сродкаў Прафсаюза, калі іншае не ўстаноўлена адпаведнай пастановай.